4. Мацко, А.Н. Борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнёта буржуазии и помещиков (1918-1939 гг.) / А.Н. Мацко. // – Минск: Беларусь, 1972. – 336 с.;
5. Historia chlopow polskich / pod redakcja Stefana Inglota. – Wroclaw: Wydawnictwo Uniwersytetu Wroclawskiego, 1995. – 395 s;
6. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 60. – Воп. 1. – Спр. 6. Заявления военных осадников о выдаче ссуды;
7. Сорокин, А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920-1939 гг.) / А.А. Сорокин. // – Минск: Наука и техника, 1968. – 204 с.;
8. ДАБВ. – Ф. 60. – Воп. 1. – Спр. 77. Заявления военных осадников о выдаче ссуд;
9. ДАБВ. – Ф. 60. – Воп. 1. – Спр. 158. Дело о наделении землёй военного осадника Ласковича Исидора 1930 г. имение Вороцевичи гмина Яновская повет Дрогичинский;
10. Кон, Ф.Я. Западная Белоруссия – колония панской Польши (к процессу над белорусской громадой) / Ф.Я. Кон. // – Москва: Издательство ЦК МОПР СССР, 1928. – 38 с.;
11. Кухарев, Б.Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919-1939 гг.) / Б.Е. Кухарев. // – Минск: Вышэйшая школа, 1975. – 112 с.;
12. Полуян, В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927-1939 гг.) / В.А. Полуян. // – Минск: Наука и техника, 1978. – 360 с.;
13. Полуян, В.А., Полуян, И.В. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920-1939 гг. / В.А. Полуян. // – Минск: Государственное издательство БССР, 1962. – 224 с.;
14. Stobniak-Smogorzewska, J. Kresowe osadnictwo wojskowe 1920-1945 / J. Stobniak-Smogorzewska. // – Warszawa, RYTM, 2003. – 420 s;
15. Ludkiewicz, Z. Wytyczne reformy agrarnej na Bialej Rusi / Z. Ludkiewicz. // – Warszawa: Wydawnictwo STRAŻY KRESOWEJ, 1920. – 40 s.

## БЕЛАРУСКІЯ ТАТАРЫ Ў ПАРТЫЗАНСКІМ РУХУ ПАДЧАС ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

***Грыбава С.У.***
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, г. Мінск, Беларусь

Беларускія татары разам з іншымі народамі СССР, у тым ліку Беларусі, удзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне, уключаючы і партызанскі рух. Гістарычна склалася такім чынам, што ў асноўным трывалыя паселішчы беларускіх татар размясціліся ў заходніх рэгіёнах краіны. Так, дадзены артыкул прысвечаны ўдзелу ў партызанскім руху дадзенай нацыянальнай меншасці ў складзе брыгад партызанскіх злучэнняў Баранавіцкай, Вілейскай, Пінскай абласцей. У брыгадах Беластоцкай і Брэсцкай абласцей беларускія татары прадстаўлены не былі. [1] Артыкул падрыхтаваны на падставе матэрыялаў Нацыянальнага архіва РБ. У ім прыводзіцца шэраг найбольш характэрных прыкладаў дзейнасці татар, жыхароў Беларусі, у партызанскім руху ў заходніх рэгіенах краіны.

У атрадзе імя Аляксандра Неўскага брыгады імя Аляксандра Неўскага, якая дзейнічала ў Юрацішкоўскім і Іўеўскім раенах Баранавіцкай вобласці (у дадзеным выпадку і далей па тэксту тэрыторыя дзейнасці брыгад падаецца па адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу на 1.01.1944 г.), змагаліся з ворагам браты Якубоўскія: Адам і Абрагім Мустафавічы з в. Кірвелі, Юрацішкоўскага раена, Баранавіцкай вобласці (суч. Іўеўскага раена Гродзенскай вобласці). У складзе іх сям'і акрамя маці з бацькам былі яшчэ пяцера сясцер і чатыры браты. Адам Мустафавіч 1920 г.н. у адзначанае вайсковае фарміраванне трапіў у снежні 1943 г. Да вайны – гарбар, меў пачатковую адукацыю, беспартыйны. Разам з партызанамі атрада ен неаднаразова прымаў удзел у баявых

аперацыях. Актыўна ўдзельнічаў у разгроме варожых гарнізонаў у раене Юрацішак. Два разы браў удзел у аперацыі "Канцэрт" (2-гі этап "Рэйкавай вайны") па падрыву чыгуначных шляхоў. Апошні час працаваў у гаспадарчым узводзе, дзе займаўся вырабам скур для партызанскіх патрэб. З абавязкамі спраўляўся добра, за што мае шэраг лістоў з падзякай. [2, лл. 319-320] Яго брат, Якубоўскі Абрагім Мустафавіч (1924 г.н.), у атрадзе змагаўся з 12 мая 1944 г. [3, л. 6] Ен таксама прымаў удзел у баявых аперацыях атрада. Змагаўся з ворагам побач з братам. [2, л. 319] Якубоўскі Абрагім 26 ліпеня 1944 г. пасля расфарміравання брыгады быў накіраваны ў Чырвоную армію, для далейшай барацьбы з ворагам. [4, лл. 12-13]

У Першамайскай брыгадзе, створанай ў маі 1943 г., якая дзейнічала ў Карэліцкім, Навамышскім, Гарадзішчанскім, Навагрудскім і Мірскім раенах Баранавіцкай вобласці, у атрадзе імя 1 Мая змагалася татарка Радкевіч Роза Сцяпанаўна (1906 г.н.) Яна мела сярэднюю адукацыю, у 1934 г. скончыла рабфак. [5, л. 194] З 1938 г. Радкевіч Р.С. з'яўлялася членам ВКП(б)Б. Да вайны займала пасаду інструктара ГК КП(б)Б. [6, лл. 105-106] У атрад трапіла з г. Брэста. У перыяд з 1 мая па кастрычнік 1943 г. Радкевіч Роза Сцяпанаўна працавала на карысць атрада ў якасці агентурнага разведчыка ў в. Гарадзішча Баранавіцкай (суч. Брэсцкай) вобл. Яна дастаўляла партызанам дакладную інфармацыю аб канцэнтрацыі варожых сіл, аб іх узбраенні і планах. З 3 кастрычніка 1943 г., уступіўшы ў шэрагі партызан атрада 1 Мая, яна ўдзельнічала ў баявых аперацыях. З 15 ліс-тапада 1943 г. па 10 ліпеня 1944 г. Радкевіч Роза Сцяпанаўна займала пасаду сакратара партарганізацыі атрада. Адначасова з 5 снежня 1943 г. яна выконвала функцыю рэдактара раеннай газеты "Чырвоны партызан". За сваю актыўную дзейнасць у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі Радкевіч Р.С. была прадстаўлена да ўзнагароды ордэнам Чырвонай Зоркі. [5, л. 194]

З 23 мая 1943 г. па 8 лістапада 1943 г. у атрадзе "Грозны" Першамайскай брыгады змагаўся татарын з в. Крынкі Мірскага раена Баранавіцкай вобласці (суч. Карэліцкага раена Гродзенскай вобл.) Хасіневіч Аляксандр Хасеневіч. Так як на базе некаторых атрадаў дадзенай брыгады, у тым ліку і атрада "Грозны", была створана новая брыгада ("25 гадоў БССР"), Хасяневіч А. Х. з 8 лістапада 1943 г. па 17 ліпеня 1944 г., застаўшыся ў Першамайскай брыгадзе, змагаўся з ворагам у атрадзе імя А.А. Жданава. [7, л. 223] Прозвішча Хасяневіча Аляксандра Хасеневіча значыцца ў спісе партызан, якія пасля расфарміравання брыгады, былі накіраваны на працу на авіязавод. [6, л. 87]

У брыгадзе імя В.П. Чкалава, якая дзейнічала ў Валожынскім і Івянецкім раенах Баранавіцкай вобласці, Дзяржынскім, Заслаўскім і Мінскім раенах Мінскай вобласці, з 29 снежня 1943 г. змагалася цэлая татарская сям'я Ясінскіх з Мінску. Маці, Ясінская Марыя Адамаўна (1905 г.н.) з дзецьмі: Барысам Ібрагімавічам (1931 г.н.), Аляксандрам Ібрагімавічам (1929 г.н.), Тамарай Ібрагімаўнай (1927 г.н.). [8, лл. 92-93] У студзені 1944 г. на базе некаторых атрадаў і дыверсійнай групы брыгады імя В.П. Чкалава была створана брыгада "За Савецкую Беларусь", якая дзейнічала ў Валожынскім раене Баранавіцкай вобл. У яе склад, а менавіта ў рэзервовы атрад, трапіла сям'я Ясінскіх, а таксама мінскі татарын Кругланскі Іосіф (1905 г.н.), які з 1 студзеня 1944 г. выконваў функцыі камандзіра ўзвода дадзенага атрада. [9, лл. 8, 49]

У складзе 2 роты брыгады імя К.К. Ракасоўскага, у атрадзе імя Ф.Э. Дзяржынскага з першых дзен існавання партызанскага фарміравання змагаўся татарын з г. Слоніма Баранавіцкай (суч. Гродзенскай) вобласці Рафаловіч Мустафа Іванавіч (1924 г.н.). [10, л. 121] Брыгада дзейнічала на тэрыторыі Слонімскага і Быценьскага раенаў Баранавіцкай вобласці. Удзельнічаючы ў баявых аперацыях атрада, Рафаловіч М. І. праявіў сябе дысцыплінаваным, адважным партызанам. Прымаў удзел у падрыве варожага эшалона. Знішчыў 4 км тэлеграфнай лініі сувязі. Пасля расфарміравання брыгады ў ліпені 1944 г. ен быў накіраваны БШПР на працу ў Мінск на аўтазавод. [11, л. 66]

У атрадзе імя А.А. Жданава брыгады "За Радзіму", якая дзейнічала ў Шаркаўшчынскім, Відзаўскім, Маладзечанскім, Браслаўскім раенах Вілейскай вобласці, змагалася татарская сям'я Якубоўскіх з г. Браслаў Вілейскай вобласці (суч. Віцебская вобл). Маці, Яўгенія Ібрагімаўна (1907 г.н.), з двума дзецьмі: сынам, Ібрагімам Ібрагімавічам (1924 г.н.) і дачкой Лімай Ібрагімаўнай (1927 г.н.) 8 мая 1944 г. сталі партызанамі адзначанага ваеннага фарміравання. [12, лл. 48-49] Якубоўская Яўгенія Ібрагімаўна ў атрадзе выконвала абавязкі повара. Да сваей справы ставілася сумленна. Карысталася павагай сярод камандавання. Пасля расфарміравання брыгады 14 ліпеня 1944 г. была адпраўлена да дому. Яе дачка, Якубоўская Ліма, таксама працавала на кухні, аднак гэтым яе функцыі не абмяжоўваліся. Ліма яшчэ выконвала абавязкі пісара ў штабе (мела 6 класаў адукацыі). Праявіла сябе дысцыплінаванай партызанкай, карысталася павагай сярод камандзіраў і байцоў атрада. Разам з маці 14 ліпеня 1944 г. была накіравана да дому. У гэтым жа атрадзе імя А.А. Жданава змагаўся яе брат, Якубоўскі Ібрагім. Беспартыйны, меў 6 класаў адукацыі. У атрадзе, знаходзячыся ў гаспадарчым узводзе, усе загады камандавання выконваў дакладна і своечасова. Каравульную службу нес добрасумленна. 1 ліпеня 1944 г. удзельнічаў у аперацыі атрада, у выніку якой быў падарваны варожы воз з боепрыпасамі, забіта і паранена 2 немца. [13, лл. 480-482] Якубоўскі Ібрагім пасля расфарміравання брыгады ў ліпені 1944 г. быў накіраваны ў распараджэнне Шаркаўшчынскага раеннага выканаўчага камітэту. [14, лл.14-15]

У атрадзе імя А.А. Жданава брыгады "За Радзіму" таксама змагаўся Гімбіцкі Іосіф (1913 г.н.) з в. Еды Шаркаўшчынскага раена Вілейскай вобласці (суч. Віцебскай вобл.). Гембіцкі Іосіф у атрадзе імя А.А. Жданава змагаўся з 1 жніўня 1943 г. па 14 ліпеня 1944. Падчас знаходжання ў дадзеным партызанскім фарміраванні ен разам з іншымі байцамі атрада ўдзельнічаў у баявых аперацыях. Падчас аднаго з баёў 21 красавіка 1944 г. у Шаркаўшчынскім раене былі забіты 47 і паранены 60 немцаў. Гембіцкі Іосіф пэўны час таксама знаходзіўся ў гаспадарчым узводзе, дзе ўсе даручэнні камандавання выконваў дакладна і тэрмінова. Зарэкамендаваў сябе дысцыплінаваным партызанам, адданым Радзіме. Пасля расфарміравання брыгады ен быў накіраваны ў шэрагі Чырвонай Арміі для далейшай барацьбы з ворагам. [13, л. 100]

Татарын Ільясевіч Хасень Ібрагімавіч быў сувязным брыгады імя К.Е. Варашылава, якая дзейнічала ў Мядзельскім, Пастаўскім, Дуніловіцкім, Астравецкім, Свірскім, Смаргонскім, Куранецкім, Глыбоцкім, Крычаўскім раенах Вілейскай вобласці і Свянцянскім раене Літоўскай ССР. Ільясевіч Х. І. нарадзіўся ў 1913 г. у в. Бакачы Мядзельскага раена Вілейскай (суч. Мінскай) вобласці. У брыгадзе ен лічыцца са снежня 1942 г. па чэрвень 1944 г. Ільясевіч Хасень Ібрагімавіч, будучы сувязным брыгады імя К.Е. Варашылава, неаднаразова хадзіў у разведку ў фашысцкія гарнізоны Мядзеля (суч. Мінская вобл.) і Дуніловічаў (суч. Глыбоцкі раен Віцебскай вобл.). Ен распаўсюджваў савецкую літаратуру і зводкі інформбюро сярод насельніцтва. Хасень Ібрагімавіч займаўся апрацоўкай скур для партызанскіх патрэб, а таксама выконваў іншыя даручэнні. Ен быў узнагароджаны медалем "За перамогу над Германіяй у Вялікую Айчынную вайну 1941-1945 гг" [15, лл.223- 224]

Ураджэнец г.п Відзы Вілейскай вобласці (суч. Браслаўскага раена Віцебскай вобл.) Асановіч Сулейман Аляксандравіч (1910 г.) з мая 1943 г. па сакавік 1944 г. быў сувязным асобнага партызанскага атрада імя П.К.Панамарэнка, а таксама з чэрвеня 1943 г. сувязным атрада А.В. Суворава брыгады імя К.Е.Варашылава Вілейскай вобласці. Ен разам з сям'ей: жонкай Марыяй Рафаілаўнай і двума малымі дзецьмі (сынам Аляксандрам 1937 г.н. і дачкой Фацімай 1944 г.н.) жыў у г. Паставы Вілейскай вобласці (суч. Віцебскай вобл.), дзе працаваў пажарным. Лёс Асановіча Сулеймана Аляксандравіча склаўся трагічна: ен быў расстраляны немцамі за сувязь з партызанамі. [16, лл. 144-148]

Актыўным барацьбітом з ворагам быў і сувязны атрада імя М.І. Кутузава брыгады імя К.Е. Варашылава Лебядзеў Канстанцін Восіпавіч (1891 г.н.). Нарадзіўся ен у Смаргоньскім раене Вілейскай вобл. (суч. Гродзенскай вобл.). З моманту арганізацыі

партызанскага фарміравання ен актыўна ўдзельнічаў у разведцы. Усе даручэнні камандавання выконваў дасканала і своечасова. Лебядзеў К. В. арганізаваў добрую сувязь праз сваіх людзей з нямецкім гарнізонам г. Смаргонь, что дало магчымасць здабываць каштоўную інфармацыю аб ворагу. Будучы старастай воласці ў Залессі (суч. Смаргонскі раен), Лебядзеў К.В. перадаваў партызанам звесткі аб планах і дзеяннях праціўніка. Ен неаднаразова выконваў ролю праваднікa партызан атрада на аперацыі па падрыву чыгуначных шляхоў. [17, лл. 373-373а.]

У складзе 4-га атрада брыгады "Спартак", якая дзейнічала ў Відзаўскім і Шаркаўшчынскім раенах Вілейскай вобласці, змагаўся з ворагам у якасці сувязнога і разведчыка татарын з в Еды Шаркаўшчынскага раена Вілейскай вобласці (суч. Віцебскай вобл.) Гембіцкі Ібрагім Якаўлевіч. Ен нарадзіўся 23 кастрычніка 1907 г., меў пачатковую адукацыю, працаваў краўцом. У атрадзе ен лічыцца з 1 кастрычніка 1942 г. па 4 ліпеня 1944 г. Гембіцкі Ібрагім веў разнастайную барацьбу супраць ворагу. Пражываючы ў в. Еды, ен неаднаразова даваў прыстанішча асобам, якія накіроўваліся ў партызанскія атрады. Ен прымаў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы ўцекаў савецкіх ваенапалонных, такіх як Струкаў Іван, Сарокін Барыс і інш., аказваў ім усебаковую дапамогу. Вельмі каштоўнай была яго дзейнасць па пашыву абутку і адзення для партызан, у тым ліку маскіруючых халатаў для зімовых аперацый. У 1943 г. акупанты падчас адной з экспедыцый абрабавалі маемасць і спалілі хату сям'і Гембіцкіх. У выніку чаго Ібрагім Якаўлевіч з жонкай і двума дзецьмі пайшоў у лес да партызан, дзе працягваў выконваць усе даручэнні камандавання атрада "Спартак". За 1943-1944 гг ен здабыў і перадаў партызанам 11 вінтовак, 18 гранатаў і значную колькасць патронаў. Гембіцкі Ібрагім Якаўлевіч сістэматычна выконваў заданні камандавання атрада па збору разведвальных дадзеных аб размяшчэнні варожых гарнізонаў, аб ваенных аб'ектах праціўніка ў Шаркаўшчынскім раене. Прасачыўшыся ў гарнізоны гарадоў Відзы, Браслаў, г.п. Шаркаўшчызна і інш., ен пры дапамозе сваіх людзей выведваў планы гітлераўцаў і паліцаяў. Так, толькі дзякуючы яго дзейнасці, своечасова былі абясшкоджаны засады Браслаўскай паліцыі ў раене в. Еды (суч. Шаркаўшчынскі раен Віцебскай вобл.). Таксама ен неаднаразова выконваў даручэнні разведвальнага характару ў раене чыгуначных станцый Ігналіна і Дукшты (суч. Віленскі раен, Літва). [18, лл. 99-101]

У склад брыгады імя Л.М. Даватара, якая дзейнічала ў Докшыцкім, Куранецкім і Мядзельскім раенах Вілейскай вобласці, з 12 снежня 1942 г. уваходзіў татарын з Докшыцкага раена Вілейскай (суч. Віцебскай) вобласці Асановіч Юза Хасеняві 1904 г.н. На жаль, лес яго склаўся трагічна: 28 верасня 1943 г. ен падарваўся ў выніку выбуху гранаты і быў пахаваны ў в. Н. Габы Мядзельскага раена Вілейскай вобласці (суч. Мінскай вобл.). [19, лл. 43-44] Паведамленне аб смерці было ўручана яго бацьку, Хасеню Іосіфавічу. [20, , л. 2]

У партызанскіх атрадах Пінскай вобласці таксама змагаліся беларускія татары, але іх колькасць была значна меншай. Гэта можна патлумачыць тым, што ўвогуле на дадзенай тэрыторыі беларускія татары не мелі значнага прадстаўніцтва.

У атрадзе імя М.І. Калініна брыгады С.М. Кірава, якая дзейнічала ў Лунінецкім і Ленінскім раенах Пінскай вобласці, змагаліся брат і сястра: Аляксандр і Ася Смольскія. У атрад яны трапілі 10 кастрычніка 1943 г. з в. Дзятлавічы Лунінецкага раена Пінскай (суч. Брэсцкай) вобласці, дзе на той момант пражывалі разам з бацькам Смольскім Якавам. [21, лл. 6, 16] Смольскі Аляксандр Якаўлевіч нарадзіўся ў 1923 г. ў г. Ляхавічы Баранавіцкай (суч. Брэсцкай) вобл. Па прафесіі гарбар, займаўся вырабкай скур. У атрадзе ен у асноўным быў задзейнічаны ў гаспадарчых справах, займаўся загатоўкай харчавання для партызан. Акрамя гэтага час ад часу ўдзельнічаў і ў баявых аперацыях. 3 ліпеня 1944 г. вызначыўся актыўнымі дзеяннямі пры падрыве чыгункі ў

раёне Дзятлавіч. Увогуле даручаныя яму заданні выконваў добрасумленна, ніякіх спагнанняў не меў. [22, л. 194] У складзе брыгады змагаўся да самага яе расфарміравання ў сувязі з вызваленнем тэрыторыі Беларусі ад ворагу, пасля чаго 18 ліпеня 1944 г. быў накіраваны ў шэрагі Чырвонай Арміі для далейшай барацьбы супраць захопнікаў. [23, лл. 56-57] Яго сястра, Смольская Ася Якаўлеўна 1922 г.н. працавала ў санчасці атрада. Праявіла сябе дысцыплінаванай, адданай Радзіме партызанкай. [22, л. 195] Пасля расфарміравання брыгады 18 ліпеня 1944 г. была адпраўлена да дому. [23, лл. 52-53]

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што беларускія татары, якія ўваходзілі ў склад адзначаных брыгад, аддана змагаліся з ворагам, сярод іх не было здраднікаў. Камандных пасад яны хоць і не займалі, аднак некаторыя з іх былі адзначаны ўзнагародамі. Параўнальна з усходнімі рэгіенамі, беларускія татары ў брыгадах партызанскіх злучэнняў заходніх абласцей краіны ў партызанскім руху былі прадстаўлены ў меншай ступені, нягледзячы на іх колькасную перавагу на дадзены тэрыторыі. Гэта магло быць абумоўлены тым, што ў асноўным буйныя паселішчы татар знаходзіліся за межамі партызанскіх зон, што значна ўскладняла сувязь з партызанамі. У тым ліку, трэба мець на ўвазе, што на захадзе Беларусі ўвогуле партызанскі рух не атрымаў вялікага распаўсюджвання.

## ЛІТАРАТУРА


1. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел на 1.01.1941 г.
Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь.
2. Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 285. Бригада им. Александра Невского Барановичской области.
3. Фонд 1399. – Воп. 1. – Спр. 480. Наградные и аттестационные листы командного состава и именные списки отряда им. Александра Невского бригады им. Александра Невского Барановичской области.
4. Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 428. Бригада им. Александра Невского, Барановичская обл.
5. Фонд 1450. – Воп. 8. – Спр. 205. Личные дела командного состава. С фамилии Раберман по фамилию Разуваев.
6. Фонд 1399. – Воп. 1. – Спр. 572. Документы о расформировании Первомайской бригады Баранавичской области (удостоверения, справки, списки), сведения о количестве раненых, о партизанах, представленных к правительственным наградам, списки партизан бригады и погибших бойцов.
7. Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 293. Первомайская бригада Барановичской области.
8. Фонд 1399. – Воп. 1. – Спр. 180. Список личного состава бригады им. В.П. Чкалова Барановичской области.
9. Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 427. Бригада "За Советскую Белоруссию", Барановичская обл.
10. Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 283. Отряды им. П.К. Пономаренко, им. Ф.Г. Дзержинского и штаб бригады им. Рокоссовского Барановичской бласти.
11. Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 374. Бригада им. К.К. Рокоссовского, Барановичская обл.
12. Фонд 1450. – Воп. 2. – Спр. 377. Список личного состава бригады "За Родину" Вилейской области.
13. Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 474. Отряды им. С.М. Кирова, им. К.Е. Ворошилова, им. А.А. Жданова, им. В.В. Куйбышева, им. В.М. Молотова бригады "За Родину" Вилейской области.
14. Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 244. Бригада "За Родину", Вилейская обл.
15. 1450,5,671 Постановления парторганов о признании граждан участниками партизанского движения Белоруссии в годы ВОВ и приложения к ним. 1975 г.
16. Фонд 1450. – Воп. 6. – Спр. 351. Постановления парторганов о признании граждан участниками партизанского движения Белоруссии в годы ВОВ и их гибели и приложения к ним. 1954 г.

17. Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 454. Отряды "Грозный", "Победа", им. П.И. Багратиона, производственная группа и связные бригады им. К.Е. Ворошилова, Вилейская обл.
18. Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 653. Постановления парторганов о признании граждан участниками партизанского движения Белоруссии в годы ВОВ и приложения к ним. 1974г.
19. Фонд 1402. – Воп. 1. – Спр. 84. Списки личного состава бригады им. Л.М. Доватора Вилейской области.
20. Фонд 1450. – Воп. 6. – Спр. 204. Бригада им. Л.М. Доватора, Вилейская обл.
21. Фонд 1407. – Воп. 1. – Спр. 78. Списки личного состава связных и агентурных работников отряда им. М.И. Калинина бригады им. С.М. Кирова Пинской области и лиц, находящихся на службе у немцев.
22. Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 235. Отряд им. М.И. Калинина бригады им. С.М. Кирова Пинской области.
23. Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 222. Бригада им. С.М. Кирова, Пинская обл.

## МАСАВАЯ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫЯ Ў ГАНЦАВІЦКІМ РАЁНЕ Ў 1949 – 1952 ГГ. ЯК ПРЫКЛАД СІСТЭМНАЙ ТРАНСФАРМАЦЫІ ТАГАЧАСНАЙ ГАСПАДАРКІ

***П.К. Дайлід***
Сярэдняя школа № 3 г. Івацэвічы, Беларусь

У лютым 1949 года адбыўся XIX з'езд КП(б)Б, на якім была пастаўленая задача перад партыйна-савецкімі арганізацыямі "палепшыць працу па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню створаных калгасаў і па прапагандзе сярод сялян-беднякоў і серад287някоў перавагаў калгаснага ладу" [1, стар.109]. Пасля гэтага з'езду і пачынаецца разгортванне масавай калектывізацыі заходніх абласцей Беларусі з многімі атрыбутамі гэтага працэсу 30-х гадоў. Як сведчаць архіўныя матэрыялы, тэмпы росту калектыўных гаспадарак у 1949-1952 гг. былі вельмі высокія.

Партыйныя органы ўвесь гэты час імкнуліся паскорыць тэмпы калектывізацыі. У маі 1949 года пры абмеркаванні ў ЦК КП(б)Б працы Пінскага абкама звярталася ўвага на яго слабую працу па калектывізацыі сялянскіх гаспадарак, адсутнасць сувязі з беспартыйным актывам. У канцы верасня 1949 года адбыўся пленум ЦК КП(б)Б, на якім было разгледжана пытанне "Аб стане і далейшых задачах калгаснага будаўніцтва ў заходніх абласцях БССР". Пасля гэтага пленума назіраецца фарсіраванне тэмпаў калектывізацыі, якое суправаджалася парушэннем прынцыпу дабраахвотнасці. Гэтыя парушэнні былі зафіксаваныя і ў Ганцавіцкім раёне. Так, 22 ліпеня 1950 года на паседжанні бюро Ганцавіцкага райкама разглядалася пытанне аб няправільных дзеяннях старшыні Люсінскага сельсавета Мельнікава пры правядзенні калектывізацыі. Як выявілася, старшыня сельсавета Мельнікаў сам пісаў заявы ад сялянаў без іх згоды і замест подпісу ставіў крыжыкі. "В результате чего 6 крестьянских хозяйств при обобществлении сельхозинвентаря и скота отказались от того, что они подавали заявления о приеме их в колхоз" [2, арк.1].

У Пінскай вобласці партыйныя арганізацыі сталі адвольна адносіць вялікую колькасць сялянскіх двароў у катэгорыю рабочых і служачых з аднaчасовым адразаннем у іх зямлі. Такім чынам павялічваўся агульны працэнт калектывізацыі. Такія фальсіфікацыі адбываліся і ў Ганцавіцкім раёне [3, арк.5].

Паварот да больш хуткіх тэмпаў калектывізацыі ў Ганцавіцкім раёне адбыўся яшчэ да XIX з'езда КП(б)Б. Аднак пасля 1949 года пачынаецца фарсіраванне тэмпаў стварэння сельгасарцеляў.